**ЗАКЛЮЧЭННЕ**
**савета па абароне дысертацый К 02.21.01 па дысертацыі**
**Носік Алесі Анатольеўны**
**“Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне”**

**Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджана вучоная ступень.** Дысертацыя Носік Алесі Анатольеўны “Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне” з’яўляецца кваліфікацыйнай навуковай працай і адпавядае спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова і галіне навукі – філалагічныя.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай задачы з ацэнкай яе значнасці.** Дысертацыя А. А. Носік з’яўляецца першым комплексным даследаваннем лексікі эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове. Саіскальнікам вызначаны асаблівасці функцыянавання субстантыўных, ад’ектыўных і дзеяслоўных эмацыянальных намінацый у мастацкім і публіцыстычным дыскурсах; распрацавана класіфікацыя негатыўных эмацыянальных намінацый з інварыянтнымі значэннямі гора, гневу, агіды, нянавісці, пагарды, віны, сораму, страху, а таксама пазітыўных эмоцый радасці, цікавасці і здзіўлення; акрэслены прынцыпы лексікаграфічнага апісання эмацыянальна-падзейнай лексікі беларускай мовы і прапанаваны спосабы яе лексікаграфавання ў “Тлумачальным слоўніку намінацый эмацыянальнай сферы чалавека”; установлена спецыфіка семантычнай дэрывацыі і выяўленых семантычных мадэлей у корпусе эмацыянальных намінацый.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку прысуджана вучоная ступень.** Савет па абароне дысертацый К 02.21.01 прысуджае Носік Алесі Анатольеўне вучоную ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова **за:**

- выяўленне і сістэматызацыю корпуса намінацый эмацыянальнай сферы чалавека (больш за 1100 лексічных адзінак, засведчаных у больш за 2800 кантэкстах, і стварэнне на гэтай аснове першага ў беларускай лексікаграфічнай практыцы “Тлумачальнага слоўніка намінацый эмацыянальнай сферы чалавека”;
- вызначэнне асаблівасцей функцыянавання субстантыўных, ад’ектыўных і дзеяслоўных намінацый эмацыянальных праяў, якія проціпастаўляюцца па катэгорыях “прадметнасць”, “квалітатыўнасць”, “акцыянальнасць”;
- распрацоўку класіфікацыі негатыўных эмацыянальных намінацый з інварыянтнымі значэннямі гора, гневу, агіды, нянавісці, пагарды, страху, віны і сораму (203 субстантывы, 155 ад’ектываў, 312 дзеясловаў), вызначэнне лексіка-тэматычных груп, якія адрозніваюцца колькаснай прадстаўленасцю лексічных адзінак і іх сінанімічных адпаведнікаў, сферай выкарыстання, наяўнасцю ці адсутнасцю другасных значэнняў, шырокай ці вузкай спалучальнасцю і іншымі паказчыкамі;
- устанаўленне спецыфікі рэпрэзентатыўнасці пазітыўных эмоцый радасці, цікавасці і здзіўлення з улікам іх актыўнага ўключэння ў дзеянне гіпанімічнай мадэлі, якая прадугледжвае ўтварэнне на аснове шырокіх і абагуленых значэнняў больш дакладных і спецыялізаваных лексіка-семантычных варыянтаў станоўчай паняційнай сферы;
- выяўленне асаблівасцей семантычнай дэрывацыі і асноўных семантычных мадэлей у адпаведнасці з характарам суаднесенасці зыходных і вытворных лексіка-семантычных варыянтаў і ступені прадстаўленасці тых ці іншых тэматычных груп і аб’яднанняў у зыходнай паняційнай сферы.

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў даследавання.**

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў лексікаграфічнай практыцы (пры ўкладанні тлумачальных слоўнікаў, распрацоўцы алгарытмаў складання дэфініцый слоўнікавых артыкулаў); у адукацыйным працэсе пры выкладанні беларускай мовы, агульнага мовазнаўства, лексікалогіі, семасіялогіі, дэрываталогіі, псіхалінгвістыкі, лінгвакультуралогіі, напісанні дыпломных і магістарскіх работ; у духоўна-культурнай сферы, мерапрыемствах і праектах, накіраваных на павышэнне ролі навуковых ведаў у забеспячэнні сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Намеснік старшыні савета
па абароне дысертацый — Н.У.Чайка

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый — Д.В.Дзятко
27.06.2024

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ імя МАКСІМА ТАНКА»